РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, поруч з творчасцю і прыгажосцю, ніколі не забываўся на сваіх выкладчыкаў-ветэранаў.**

# Веснавы **канцэрт**

Рэктарат на чале з Барысам Святловым, прафсаюз і ветэранская арганізацыя ўстановы запрасілі колішніх супрацоўнікаў-пенсіянераў на веснавы канцэрт, дзе выступілі і студэнты, і выкладчыкі. Рэктар запэўніў: "Мы хочам, каб вы не адчувалі сябе адзінокімі, нам патрэбны вашы веды і вопыт".

Ветэраны ВАВ Л.Б. Міронава, М.М. Барысава, В.С. Ганчарова, Т.Т. Латоціна і іншыя не толькі сказалі колькі слоў са сцэны, але і цудоўна спелі. Узнікла таксама ідэя стварэння ветэранскага хору пры БДУКіМ.

**Галіна МАХАЕВА,**
**пенсіянер-ветэран БДУКіМ**